Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Актывісты і ўдзельнікі акцый супраць інтэграцыі працягваюць атрымліваць пратаколы

13.01.2020 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Ілля Дабратвор. Фота:baj.by

У дачыненні да сябра Партыі БНФ **Іллі Дабратвора** складзены пратакол правапарушэння па ч.1 арт. 23.34 КаАП за ўдзел у акцыі супраць інтэграцыі з Расіяй 20 снежня.

> *“Дэманстратыўна выкрыкваў лозунгі “Жыве Беларусь!” і “Незалежнасць!”*, - пазначана ў пратаколе правапарушэння, складзеным 10 студзеня старэйшым участковым Бараўлянскага аддзялення міліцыі Мінскага РУУСа **Аляксеем Аўчыннікавым.**

Нагадаем, 26 снежня суд Маскоўскага раёна Мінска аштрафаваў на 30 базавых велічынь Іллю Дабратвора за парушэнне арт. 23.34 КаАП Беларусі — "Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў" за ўдзел у акцыі ў падтрымку незалежнасці 7 снежня. Ілля Дабратвор у той дзень быў на акцыі ў якасці журналіста.


Сябра Рады БНК і Прэзідыума БСДП **Алесь Абрамовіч** 12 студзеня атрымаў паведамленне па пошце аб узбуджэннні супраць яго адміністрацыйнай справы паводле артыкула 23.34 КаАП РБ з нагоды ўдзелу 20 снежня ў несанкцыянаваным мітынгу і шэсці ў Мінску супраць інтэграцыі Беларусі і Расіі.

Справа ўзбуджаная намеснікам начальніка УУС адміністрацыі Ленінскага раёна горада Мінска **С. Дубовікам.**


Даты судоў над актывістамі пакуль не прызначаныя.

Твитнуть





Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO


## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў

# рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць










## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY